ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
11 09 2014 г.

Будзем знаёмыя

# ЦІ ЛЁГКА БЫЦЬ... ГЕНІЕМ?

## «Не ведаю» — не для гэтага хлопца

**Першае, што ўражвае ў гэтым юнаку, — іранічная ўсмешка і пачуццё гумару. Ён нават чымсьці нагадвае расійскага шоўмена Івана Урганта. І знешне падобны да яго, і па вострае слова ў кішэню не лезе. А яшчэ ён — тонкі псіхолаг, які вельмі добра адчувае свайго суразмоўцу. Часам здаецца, бачыць яго наскрозь. І гэта пры тым, што юнак ад нараджэння невідушчы.**



Павел віртуозна іграе на баяне і марыць стаць дыджэем.

Павел Міхайлоў — адзін з лепшых сёлетніх выпускнікоў Шклоўскай школы-інтэрната для дзяцей з парушэннямі зроку. Ён на дастаткова высокім узроўні ведае камп'ютар, віртуозна іграе на баяне, дасканала валодае нямецкай мовай. Магчыма, такія маладыя людзі зараз не выключэнне, але ж Павел дасягнуў гэтых вынікаў пры адсутнасці зроку.

Маці працягвае мне цэлы стос ганаровых грамат і падзячных лістоў — за гады вучобы ў школе-інтэрнаце сын неаднаразова займаў прызавыя месцы. На вочы трапіла некалькі падзяк за перамогу ў гульнях «Самы разумны» і «Самы кемлівы», граматы са словамі ўдзячнасці ад кіраўніцтва ўстановы за выніковы ўдзел у трэцім этапе рэспубліканскай алімпіяды па матэматыцы, некалькі дыпломаў пераможцы другога і трэцяга этапаў рэспубліканскай алімпіяды па нямецкай мове. А ў пахвальным лісце, які ён атрымаў сёлета разам з атэстатам, адзначаюцца яго асаблівыя поспехі ў вывучэнні замежнай мовы і інфарматыкі.

Як толькі Павел пазнаёміўся з камп'ютарам, яго запаветнай марай стала вывучыцца на праграміста. Сярод вучняў ён лічыўся самым дасведчаным у гэтай галіне. Да яго звярталіся па дапамогу і таварышы па вучобе, і нават настаўнікі. Ён даваў кансультацыі і па тэлефоне. Пра новыя праграмы таксама даведваліся менавіта ад яго. Хлопец марыў паступаць у БДУ на факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі і, напэўна, стаў бы адным з лепшых студэнтаў універсітэта. Але чамусьці лічыцца, што гэтая прафесія не для невідушчых. Так што з марай давялося расстацца.

Затое як радаваліся настаўнікі Шклоўскай дзіцячай школы мастацтваў, калі Паша падаў дакументы ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў! Настаўніца па музыцы Ала Янісава лічыць, што выбраць гэты шлях яго падштурхнула найвышэйшая адзнака па спецыяльнасці. Сёлета толькі ён ды яшчэ адзін вучань з усёй установы атрымалі дзясяткі.

Ала Янісава спадзяецца, што яму пашчасціць з выкладчыкамі. Сама яна спачатку скептычна паставілася да хлопца і яго магчымасцяў. Але праз нейкі час зразумела, што Павел надзвычай таленавіты — у яго абсалютная памяць і вельмі добры музыкальны слых.

Ва ўніверсітэце ацанілі не толькі выдатную музычную падрыхтоўку выпускніка Шклоўскай дзіцячай школы мастацтваў, але і яго добрыя веды па агульнаадукацыйных прадметах. Па рускай мове ён набраў падчас тэсціравання больш за 80 балаў, па гісторыі Беларусі — звыш 70. І гэта пры тым, што гісторыя была не самым «моцным» яго прадметам. Яго прага да ведаў вартая захаплення. «Аднойчы ён спытаўся ў мяне: навошта людзі прыдумалі слова «не ведаю»?» — усміхаецца маці Паўла.

У школе-інтэрнаце, дзе Павел знаходзіўся большую частку свайго жыцця, памятаюць, як у 7 гадоў ён з ходу асвоіў чытанне па Брайлю і «падсеў» на кнігі. Сёння ў крамах, бібліятэках, інтэрнэце літаратура — на любы густ: чытай — не хачу. У Паўла, на жаль, выбар абмежаваны. Ён можа чытаць толькі па Брайлю, а такіх кніг няшмат. У школьнай бібліятэцы ён, напэўна, перачытаў усё. І асабліва яго цікавілі энцыклапедыі. Тыфлапедагог Гульнара Міронава ўспамінае, што ён заўсёды ведаў адказ на любое пытанне. Аднакласнікі нават звалі яго геніем. Аднойчы на абласной алімпіядзе па матэматыцы незвычайны вучань здзівіў настаўнікаў схемай рашэння складанай задачы для сёмага класа. Ён так добра патлумачыў усё на прыкладзе ўзаемадзеяння двух хлопцаў, што эксперты былі ўражаны. Такі нестандартны метад рашэння яны пачулі ўпершыню.

Настаўніца нямецкай мовы Вольга Клюйко ўжо некалькі гадоў не працуе ў школе-інтэрнаце, але і сёння захапляецца здольнасцямі свайго вучня. Ён незвычайны ўжо тым, што адзіны на яе ўроках размаўляў выключна па-нямецку, прычым на розныя тэмы. Задаваў пытанні пра сутнасць жыцця, каханне, цікавіўся, як жыць, калі пачуцці не падзяляюць... Наогул, веды яго выходзілі далёка за рамкі школьнага навучання. Ён нават марыў стварыць праграму па вывучэнні нямецкай мовы праз інтэрнэт для тых, хто мае праблемы са зрокам.

**Ён так добра патлумачыў задачу на прыкладзе ўзаемадзеяння двух хлопцаў, што эксперты былі ўражаны.**

Аднойчы на ўваходзе ў школу, дзе праходзіла раённая алімпіяда па нямецкай мове, настаўніца Таццяна Чыкіза, якая суправаджала Пашу, забыла папярэдзіць, што ў дзвярэй зверху нізкі вушак. І вельмі перапалохалася, калі Павел схапіўся за лоб. Але ён хутка прыйшоў у сябе і супакоіў: «Не турбуйцеся, Таццяна Міхайлаўна, дагэтуль у мяне была каша ў галаве, а цяпер усё легла па палічках». Цікава, што ён сапраўды стаў пераможцам алімпіяды. Роўна праз год па дарозе на чарговую алімпіяду вучань з настаўніцай... паслізнуліся на лёдзе. Трэба было бачыць, як ляцелі кніжкі ў розныя бакі. Настаўніцы было не да смеху, а Павел толькі пажартаваў: «Гісторыя, здаецца, паўтараецца. Першае месца нам забяспечана». Усё спраўдзілася і на гэты раз.

Настаўнікі кажуць пра Паўла: вельмі таленавіты хлопец, але прынцыповы і з цвёрдым характарам. Ніколі не будзе займацца тым, што яму нецікава.

Знайсці агульную мову з Паўлам няпроста, ён не з тых, хто пойдзе з кожным на кантакт. Калі адчувае, што шчырасці няма і ў паміне, замыкаецца. Але на любімыя тэмы — пра камп'ютары ці электронную музыку — можа гутарыць доўга. З захапленнем слухае Армена Ван Бюрэна, вядомага сваімі кампазіцыямі ў стылі «транс», і марыць стаць такім жа вядомым дыджэем. Прызнаецца, што вельмі хацеў бы навучыцца рабіць рэміксы. Па жыцці ён аптыміст. «Жыву, ні на што не скарджуся», — агучвае сваю жыццёвую пазіцыю. І верыць, што анёл-ахоўнік ніколі яго не пакіне. А яшчэ ён марыць аб каханай дзяўчыне і моцнай сям'і. Вельмі хочацца, каб усе яго жаданні здзейсніліся.

**Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.**

РЕПОЗИТОРИЙ